View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

лінскай уніі з Польшчай 1569 года». У 1841 г. у Познані пры ўдзеле І. Лялевеля быў выдадзены на мове арыгінала Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 г.

Выдатны гісторык-рамантык, ён адным з першых загаварыў аб беларускай дзяржаўнасці, паставіўшы сярэдневяковую «рэспубліку» Полацка побач з Вялікім Ноўгарадам. І. Лялевель асаблівую ўвагу звярнуў на важнасць вывучэння эвалюцыі грамадскага і палітычнага ладу дзяржавы, яе прававой сістэмы для боль глыбокага і дасканалага пазнання агульнай гісторыі народа, падкрэсліваў ролю народных масс у гісторыі краіны.

На нашу думку, асноўным недахопам гістарычных прац І. Лялевеля было тое, што ён падтрымліваў прэтэнзіі палякаў на ўкраінскія і беларускія землі і абгрунтоўваў сваю пазіцыю тым, што быццам бы Ягайла абяцаў далучыць Вялікае княства да Польшчы. Ён пісаў: «Літва, прыступаючы да саюза з Польшчай, абавязана перадаць ёй і цэлае Падолле, і Валынь, і Украіну з Кіевам... паколькі ўсё гэта ўваходзіла ў склад княства і па праву павінна належаць Польшчы, а не Літве» [5, с. 124].

Распрацоўкі славутых навукоўцаў, патрыётаў роднай зямлі, сталі грунтам зараджэння нацыянальнаго накірунка ў гісторыка-прававой навуцы, які прынцыпова адрозніваўся ад падыхода польскіх і расійскіх вучоных.

ЛІТАРАТУРА

1. Биографический словарь профессоров и преподавателей Императорского университета Св. Владимира (1864 – 1884) / сост. под ред.: В.С. Иконников. орд. Проф. – Киев. Тип. ун-та Св. Владимира,1884. – 860 с.
2. Данилович, И. О литовских летописях / И. Данилович // Журнал М-ва народного просвещения. – 1840. – № 11. – С.101 – 136.
3. Коялович, М. Чтения по истории Западной России: Прил. этнограф. карта. – Новое изд., перераб. и доп. с изд. 1864 г. / М. Коялович. – СПб. Тип. Суворина, 1884. – XIII, 349 с. 1 л.
4. Марціновіч, А.А. У часе прасветленыя твары: Гіст. эсэ, нарысы / А.А. Марціновіч. – Мінск: Полымя, 1999. – 446 с.
5. Вішнеўская, І.У. Палітычная і прававая думка Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый / І.У. Вішнеўская. – Мінск: Тэсей, 2008. – 295 с.

PolotskSU

## УПЛЫЎ ІДЭЙ РЭФАРМАЦЫІ НА РАЗВІЦЦЕ ПАЛІТЫКА-ПРАВОВОЙ ДУМКІ БЕЛАРУСІ Ў XVI СТ.

***Жук Д. С.***

Навукоўцы, якія даследуюць перыяд Рэфармацыі ў Беларусі, адзначаюць, што яна была звязана ў першую чаргу з росквітам усіх сфер грамадскага жыцця, у тым ліку і з росквітам палітыка-прававой ідэі. Менавіта на перыяд распаўсюджання Рэфармацыі прыпадае Залаты Век Беларусі.

Рэфармацыя (ад лац. Reformatio – пераўтварэнне) – шырокі сацыяльна-палітычны і ідэалагічны рух, накіраваны супраць рымска-каталіцкай царквы і яе

ролі ў палітычнай сістэме грамадства, які прывеў да ўзнікнення розных форм пратэстантызму. Ідэйнымі крыніцамі Рэфармацыі былі гуманізм эпохі Адраджэння і сярэдневяковыя ерасі. Гуманісты выступалі з крытыкай сярэдневяковага светапогляду і абгрунтавалі прынцыпы буржуазнага індывідуалізму. Галоўнае месца ў ідэалогіі займала вучэнне пра тое, што для выратавання душы верніка не патрабуецца пасрэдніцтва царквы, таму адмаўлялася неабходнасць яе існавання з усей іерархіяй на чале з папам рымскім. Адзінай крыніцай веры было абвешчана Свяшчэннае пісанне – Біблія; адмаўлялася значэнне Свяшчэннага падання. Пачаткам Рэфармацыі лічыцца выступленне 31 кастрычніка 1517 прафесара тэалогіі Вітэнбергскага ўніверсітэта ў Германіі М.Лютэра, у якім ен асудзіў гандаль папскімі індульгенцыямі. У ліку вядучых тэарэтыкаў Рэфармацыі былі тэолагі са Швейцарыі У. Цвінглі і Ж. Кальвін (бюргерска-буржуазны кірунак) і германскі святар Т. Мюнцэр (сялянска-плебейскі кірунак) [1, с. 177].

У XVI ст. у Вялікім княстве Літоўскім паступова ствараюцца неабходныя ўмовы для палітыка-прававых пераўтварэнняў. Вялікая роля тут належыць ідэям Рэфармацыі, якія ў першую чаргу звярталіся да чалавечага розуму і абуджалі людзей вясці барацьбу за свабоду (у тым ліку рэлігійную) і ўстанаўленне справядлівасці ў грамадстве і дзяржаве.

На фарміраванне Рэфармацыі ў Беларусі паўплывалі заходне-еўрапейскі гуманізм, гусіцкая ідэалогія, вучэнні правадыроў еўрапейскай Рэфармацыі (асабліва кальвінізм), ідэі рускага вальнадумства [1, с. 177].

Як адзначае прафесар В.Ф. Шалькевіч, рэфармацыйны рух праявіўся ў ВКЛ галоўным чынам у формах лютэранства, кальвінізма і арыянства (антытрынітарызму) [2, с. 75].

Да 1560 рэфармацыйны рух у Беларусі праяўляўся ў форме кальвінізму, які адрозніваўся ад заходне-еўрапейскага кальвінізму большай цярпімасцю. Пры пратэстанцкіх абшчынах адкрываліся школы, шпіталі, друкарні і інш. У 1560-я гады адбыўся раскол кальвініцкага лагера. З яго вылучыўся радыкальна-рэфармацыйны кірунак – антытрынітарызм (прыхільнікі арыянства). Яго прадстаўнікі (Я. Кішка, С. Будны, В. Цяпінскі-Амельяновія, П. Гезка, М. Чаховіц, Л. Крышкоўскі і інш.) крытыкавалі асновы феадалізму, выказвалі свае адносіны да дзяржавы, дзяржаўных інстытутаў, да маемасці. Пераемнікамі антытрынітарыяў былі сацыніяне. Своеасаблівасцю Беларусі было тое, што ў рэфармацыйным руху ўдзельнічалі і выхадцы з праваслаўнай царквы. Пасля заключэння Люблінскай уніі 1596 г. у Беларусі пачалося наступленне контррэфармацыі, большасць магнатаў перайшла ў каталіцтва, што прадвызначыла паступовае згасанне Рэфармацыі [1, с. 177].

Дзякуючы Рэфармацыі ў Беларусі ў XVI ст. актыўна развівалася асветніцкая дзейнасць. Да ліку прадстаўнікоў Рэфармармацыі розныя вучоныя адносяць Ф. Скарыну, А. Волана, М.Р. Чорнага, Л. Сапегу і іншых грамадска-палітычных дзеячаў таго часу. Іх дзейнасць спрыяла ўмацаванню і развіццю ідэй свабоды, справядлівасці, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, гуманізма, верацярпімасці, дзяржаўнага суверэнітэту, ідэі прававой дзяржавы (Л. Сапега) і інш.

Знакамітыя тагачасныя мысліцелі і дзяржаўныя дзеячы былі або цесна звязаны з рэфармацыяй або з'яўляліся кальвіністамі, антытрынітарыямі і інш.

PolotskSU

Так, напрыклад, А. Волан з’яўляўся адным з яскравых прадстаўнікоў рэфармацыйнага руху XVI ст. і прытрымліваўся ідэалогіі кальвінізму. Яго прававая і палітычная дзейнасць засноўвалася на трох катэгорыях: свабодзе, роўнасці і справядлівасці, якія і сёння з’яўляюцца першапачатковымі накірункамі пры будаўніцтве дэмакратычных дзяржаў і развіцціх прававых сістэм. Ён сцвярджаў, што права павінна быць справядлівым, выступаць гарантам свабоды і роўнасці, быць разумным. А. Волан адстойваў ідэю роўнасці перад законам прадстаўнікоў усіх саслоўяў і лічыў, што менавіта роўнасць людзей перад законам, яе ўвасабленне ў палітычным жыцці вызначаюць дасканаласцьдзяржавы. Сугучнасць гэтай думкі можна знайсці ў Статуце ВКЛ1588 г. (раздз. I, арт. 1). А. Волан паказвае ўсю важнасць ролі кіраўніка дзяржавы, а таксама акцэнтуе ўвагу на асабістых якасцях гасудара. У прыватнасці, ён адзначае, гасудару больш за ўсё належыць валодаць мужнасцю і воляй, клапаціцца пра праўдзівую рэлігію, ведаць навукі, весці бездакорны лад жыцця, быць справядлівым і шчодрым. У раздзеле I Статута ВКЛ 1588 г. гаворыцца пра прававое становішча вялікага князя ў ВКЛ, а ў арт. 1 гэтага раздзела князь абяцае і абавязваецца судзіць і дзейнічаць па адных законах у дачыненні да ўсіх саслоўяў ВКЛ, г. зн. паступаць справядліва.

Трэба адзначыць, што ўвогуле ідэолагі Рэфармацыі паспрыялі развіцццю асноўных актуальных тагачасных прававых, палітычных, сацыяльных і іншых праблем адносна прынцыпаў дзяржаўнага кіравання і жыцця, абароны суверэнітэту, суадносін свецкай і духоўнай улады, ролі закона, свабоды, справядлівасці і маралі ў грамадстве.

Увогуле Рэфармацыя паўплывала на палітычную і прававую думку, на свядомасць чалавека і змяніла ў больш прагрэсіўны бок светапогляд усяго грамадства, бо яно ўжо тады было гатовым да якасных змен свайго палітычнага і прававога быцця. Аб гэтым яскрава сведчаць прагрэсіўныя нормы, якія потым, у выніку такога ўплыву, былі замацаваны ў Статутах ВКЛ 1566 і 1588 гг.

Вялікай заслугай прадстаўнікоў Рэфармацыі з’яўлялася тое, што яны заклікалі праводзіць палітыка-прававыя змены грамадства і дзяржавы толькі шляхам паступовай іх эвалюцыі, пазбягаючы пры гэтым гвалтоўных метадаў і не выходзячы за межы закона і хрысціянскай маралі.

Адмаўленне ролі каталіцкай царквы як пасрэдніка паміж чалавекам і Богам і надзяленне чалавека большай самастойнасцю дало падставу для фарміравання ідэі неад’емных правоў чалавека, да якіх адносяцца права на жыццё, уласную маемасць, свабоду (у тым ліку свабоду рэлігіі).

Такім чынам, у той час быў закладзены падмурак для фарміравання і станаўлення сучаснай дэмакратычнай прававой сістэмы Беларусі з улікам прагрэсіўных ідэй Рэфармацыі, якія былі адлюстраваны ў палітыка-прававой думцы XVI ст.

## ЛІТАРАТУРА

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Т. 6. Кн. 1 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: БелЭн, 2001. – 238 с.
2. Шалькевіч, В.Ф. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі / В.Ф. Шалькевіч. – Мінск: Маладзежнае навуковае супольніцтва, 2002. – 247 с.